ПРАЛЕТАРЫІ УСЁХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЗАРА

орган Брэсцкага абкома КП(б)Б і абвыканкома

№ 254 (326) | Аўторак 5 лістапада 1940 г. | Цана 10 кап.

Няхай жыве знешняя палітыка Совецкага ўрада, палітыка міру паміж народамі і забеспячэння бяспечнасці нашай радзімы!

Няхай жыве наша родная Чырвонай Армія — магутны аплот мірнай працы народаў СССР, верны вартавы заваявання Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі!

(З лозунгаў Цэнтральнага Камітэта ВКП(б)

ЛОЗУНГІ ЦК ВКП(б)

да XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі

1. Няхай жыве XXIII гадавіна Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі ў СССР!

2. Братам па класу, вязням капітала, барацьбітам за вызваленне рабочага класа ва ўсім свеце — наша брацкае прывітанне!

3. Умацуем інтэрнацыянальныя сувязі рабочага класа СССР з рабочым класам капіталістычных краін! Вышэй сцяг міжнароднай пролетарскай салідарнасці!

4. Няхай жыве знешняя палітыка совецкага ўрада, палітыка міру паміж народамі і забеспячэння бяспечнасці нашай радзімы!

5. Няхай жыве наша родная Чырвоная Армія — магутны аплот мірнай працы народаў СССР, верны вартавы заваявання Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі!

6. Працоўныя Совецкага Саюза! Не забывайце аб капіталістычным акружэнні! Будзем пільна ўмацоўваць нашу Чырвоную Армію і нашу соцыялістычную разведку—ВЧК!

7. Няхай жыве Ваенна-Марокі Флот Совецкага Саюза — надзейная ахова совецкіх марокіх граніц!

8. Няхай жыве магутная совецкая авіяцыя! Няхай жывуць совецкія лётчыкі—гордыя сокалы нашай радзімы!

9. Прывітанне мужным і бясстрашным байцам —цягранічнікам, воркім вартавым краіны соцыялізма!

10. Прывітанне працоўным Літвы, Латвіі, Эстоніі, Бесарабіі, Паўночнай Букавіны, будуючым сваё свабоднае жыццё ў вялікай брацкай сям'і народаў Совецкага Саюза!

11. Няхай жыве Саюзная Малдаўская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка!

12. Няхай жыве Саюзная Літоўская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка!

13. Няхай жыве Саюзная Латвійская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка!

14. Няхай жыве Саюзная Эстонская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка!

15. Няхай жывуць брацкі саюз і дружба народаў Совецкага Саюза!

16. Стахановцам прамысловасці, транспарту, гандлю і сельскай гаспадаркі, знатным людзям нашай краіны — большавіцкае прывітанне!

17. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі чорнай і каляровай металургіі! Змагайцеся за павелічэнне вытворчасці металу, за яго якасць!

18. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі машынабудаўнічай прамысловасці! Змагайцеся за развіццё самага перадавога ў свеце машынабудаўніцтва!

19. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі абаронпай прамысловасці! Мацуйце абаронную магутнасць нашай радзімы! Узбройвайце Чырвоную Армію і Ваенна-Марокі Флот навейшай тэхнікай!

20. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі паліўнай і энергетычнай прамысловасці! Большавіцкімі тэмпамі рухайце ўперад здабычу паліва і вытворчасць электраэнергіі! Умацоўвайце паліўную і энергетычную базу СССР!

21. Работнікі хімічнай прамысловасці! Змагайцеся за стварэнне магутнай хімічнай прамысловасці нашай краіны!

22. Таварышы будаўнікі! Змагайцеся за паскарэнне тэмпаў будаўніцтва, за ўдасканаленне і высокую якасць будоўляў!

23. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі лёгкай і тэкстыльнай прамысловасці! Больш паркалю, шоўку, сукна, трыкатажу, абутку, вопраткі для грамадзян Совецкай краіны! Змагайцеся за высокую якасць прадукцыі!

24. Створым магутныя дзяржаўныя працоўныя рэзервы для прамысловасці і транспарта!

25. Калгасная і гарадская моладзь! Ідзіце ў школы Фабрычна-Заводскага Абучэння, Рамеслевыя і Чыгуначныя вучылішчы! Рыхтуйцеся стаць кваліфікаванымі работнікамі нашай радзімы!

26. Барацьба з прагульшчыкамі і дэзарганізатарамі вытворчасці ёсць барацьба за ўмацаванне магутнасці нашай радзімы і яе Чырвонай Арміі. Няхай жывуць працоўная дысцыпліна і ўзорны парадак на прадпрыемствах нашай радзімы!

27. Калгаснікі і калгаснікі! Змагайцеся за высокія ўраджаі і ўздым грамадскай жывёлагадоўлі! Умацоўвайце грамадскую гаспадарку калгасаў. Няхай жыве заможнае і культурнае жыццё калгасаў!

28. Служачыя совецкіх устаноў! Змагайцеся за ўмацаванне дзяржаўнай дысцыпліны, за дакладнае выкананне совецкіх законаў!

29. Работнікі дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю! Змагайцеся за лепшае абслугоўванне совецкага спажыўца, за культурны совецкі гандаль у горадзе і вёсцы!

30. За далейшы росквіт соцыялістычнай культуры народаў СССР, за новыя поспехі і заваяванні совецкай навукі, тэхнікі, мастацтва!

31. Няхай жыве роўнапраўная жанчына Совецкага Саюза—актыўная ўдзельніца ў кіраванні дзяржавай, гаспадарчымі і культурнымі справамі нашай краіны!

32. Выхаванне ўсёй масы членаў профсаюзаў у духу ленінізма — пачесны абавязак совецкіх профсаюзных арганізацый! Няхай жывуць совецкія профсаюзы —школа комунізма!

33. Разгорнем крытыку нашых недахопаў! Умацуем яшчэ больш магутнасць і арганізаванасць нашай дзяржавы!

34. Няхай жыве комсамол — верны памочнік большавіцкай партыі! Няхай жыве совецкая моладзь—будучыня нашай радзімы!

35. Навучаючыяся совецкай школы! Авалодвайце навукай, рыхтуйцеся стаць барацьбітамі за справу Леніна—Сталіна!

36. Няхай жыве і мацнее наша магутная радзіма — Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

37. Няхай жыве наш рабочы клас!

38. Няхай жыве наша калгаснае сялянства!

39. Няхай жыве наша совецкая інтэлігенцыя!

40. Няхай жыве Усесаюзная Комуністычная партыя большавікоў — перадавы атрад працоўных Совецкага Саюза!

41. Няхай жыве Комуністычны Інтэрнацыянал — арганізатар барацьбы за перамогу працоўных!

42. Няхай жыве вялікі непераможны сцяг Маркса-Энгельса - Леніна - Сталіна! Няхай жыве ленінізм!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ УСЕСАЮЗНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большавікоў).

І. ЛАЎРЫСЦІН, старшыня Соўнаркома Эстонскай ССР

ПЕРШЫЯ ПОСПЕХІ СОВЕЦКАЙ ЭСТОНІІ

Эстонскі народ, вызвалены ад капіталістычнага гнёту, упершыню будзе свабодна святкаваць гадавіну Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Гэтае свята ён адзначае першымі перамогамі на фронце гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Прамысловасць буржуазнай Эстоніі знаходзілася ў катастрафічным становішчы. Фабрыкі і заводы работалі з палавіннай нагрузкай, а многія зусім бяздзейнічалі. Масавыя звальненні рабочых былі звычайным з'явішчам. Дзесяткі тысяч беспрацоўных цягнулі жабрацкае існаванне.

З першых-жа дзён устанаўлення совецкай улады ў фабрычных і заводскіх карпусах закіпела работа. Ля заіржавелых станкоў павяліся людзі, пачаўся рамонт абсталявання, адно за другім уступалі прадпрыемствы ў строй. Пушчана ў ход, бяздзейнічаючая сем год запалкавая фабрыка, рыхтуецца да пуска буйны завод „Двигатель" і многія другія прадпрыемствы. Толькі да 1 верасня совецкая ўлада дала работу не менш, чым 18 тысячам беспрацоўных. У верасні 1 кастрычніку набор новых рабочых працягваўся яшчэ большымі тэмпамі. Дастаткова прывесці ў прыклад Кренгольмскую мануфактуру ў Нарве. Да 21 чэрвеня 1940 года тут работала 1 860 рабочых, а ў канцы кастрычніка — 3769. На Балтійскую папераапрадзільную фабрыку ў верасні прынята 300 рабочых, на фабрыку „Лютер" — 160 чалавек і т. д. Заводы і фабрыкі работаюць бесперабойна, многія — у дзве змены. Павялічылася вытворчасць прадукцыі, чаму ў намалай ступені дапамагае шырока разгарнуўшаяся соцыялістычнае спаборніцтва.

Разам з рабочым класам радасна святкуе XXIII гадавіну Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі працоўнае сялянства Эстоніі. Зараз у рэспубліцы ажыццяўляецца зямельная рэформа. Да звяржэння плутакратычнага ўрада каля 65 проц. зямлі знаходзілася ў руках памешчыкаў і кулакоў. Па папярэдніх данных на 20 кастрычніка, беззямельныя і малазямельныя сяляне ўжо атрымалі больш 260 тысяч гектараў зямлі. Па рашэнню Соўнаркома Эстонскай ССР і ЦК КП(б) Эстоніі сялянам, надзеленым зямлёй, прадастаўлен доўгатэрміновы крэдыт у суме 7,2 мільёна крон. Гэты крэдыт адпускаецца на набыццё сельскагаспадарчага інвентара, пакупку жывёлы, пабудову жылых і гаспадарчых памяшканняў.

Ніколі яшчэ ў эстонскай вёсцы не панавала такая радасць, як у гэтыя дні. Гэта і зразумела. Ніхто раней не мог даць эстонскаму сялянину таго, што дала яму за такі кароткі тэрмін совецкая ўлада.

Побач з гаспадарчым уздымам маладая Эстонская Совецкая рэспубліка мае [illegible] культурныя дасягнення [illegible] навучаючыхся пач[illegible] сярэдніх школ павя[illegible] параунанні з мінулым [illegible] на 11 тысяч, колі[illegible]тай Тартускага ў[illegible] Таліпскага тэхнічнага [illegible] больш чым на 35[illegible]

Рэарганізаваны [illegible] навуковых устаноў. Рамеслена-мастацкая школа ў Таліне ператворана ў вышэйшую школу прыкладных мастацтваў імені Яна Коорта, школа мастакоў „Паулас" у Тарту—у вышэйшую мастацкую школу імені Коврада Мягі, прыватная музыкальная школа ў Тарту рэарганізавана ў сярэднюю музыкальную школу. У Таліне адкрыт вячэрні тэхнікум, школа інашаземных моў, у гарадах Валга і Нарве — новыя пачатковыя музыкальныя школы. Арганізавана сетка розных курсаў і гурткоў па павышэнню агульна-адукацыйнага ўзроўню і вытворчай кваліфікацыі рабочых і служачых. Працоўныя цягнуцца да ведаў, доступ да якіх раней быў для іх закрыт.

Сустракаючы XXIII гадавіну Кастрычніка ў адзінай брацкай сям'і народаў вялікага Совецкага Саюза, працоўныя Совецкай Эстоніі горача дзякуюць сваю вызваліцельніцу — доблесную Чырвоную Армію, верную абаронцу граніц соцыялістычнай радзімы. Наша святочная задача — мацаваць абараназдольнасць краіны, не забываць ні на мінуту указання таварыша Сталіна, што мы знаходзімся ў капіталістычным акружэнні і павінны трымаць [illegible] народ у стане пастаян[illegible] мабілізацыйнай гатоўнас[illegible]

Падрыхтоўка да [illegible] ны Кастрычніцкай [illegible] най рэволюцыі [illegible] ны палітычн[illegible] па ўсёй [illegible] многія в[illegible] ўсіх галі[illegible] даўніцт[illegible]

Пачалося вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты абласнога і раённых Советаў дэпутатаў працоўных

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР

аб парадку прымянення артыкула 69 „Палажэння аб выборах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія и пасялковыя советы дэпутатаў працоўных БССР" пры выстаўленні кандыдатаў у дэпутаты мясцовых советаў дэпутатаў працоўных БССР у сельскіх мясцовасцях заходніх абласцей Беларускай ССР.

Устанавіць, што права выстаўлення кандыдатаў у дэпутаты абласных, раённых, гарадскіх, сельскіх і пасялковых Советаў дэпутатаў працоўных у сельскіх мясцовасцях заходніх абласцей Беларускай ССР ажыццяўляюць, побач з грамадскімі, [illegible] і раённымі органамі грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных, [illegible] агульныя сходы сялян па сельскіх Советах і вёсках.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. НАТАЛЕВІЧ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Л. ПАПКОЎ

1 лістапада 1940 г., гор. Мінск.

ДАСТОЙНЫ СЫН НАРОДА

Працоўныя Азяцкага сельсовета вылучылі кандыдатам у дэпутаты Жабінкаўскага райсовета

таварыша Багдановіча Леона Нікалаевіча

З вялікім палітычным уздымам прайшоў сход пайнікаў Азяцкага сельпо, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты раённага і сельскага Советаў. На сходзе прысутнічала 227 чалавек. [illegible] даклада аб значэнні выбараў выступіла 15 чалавек.

Селянін вёскі Бараны Пётр Нікіфаравіч Жалько ў сваім выступленні сказаў:

— Я вітаю падыходзячыя выбары ў мясцовыя Советы — [illegible] нашы родныя органы ўлады. Мы павінны паслаць туды лепшых сыноў і дачок нашага народа. Я прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты раённага Совета бедняка і вёскі Аматы тав. Багданові[illegible] она Ні[illegible]віча. [illegible] працоў[illegible]ны, пачы[illegible] валі яго ў турмы. [illegible] зламаць яго волі. [illegible] лейшым, пад кіраўн[illegible] большавікоў, працаваць разам са сваім народам, за яго працвітанне. Я заклікаю таварышоў падтрымаць кандыдатуру тав. Багдановіча.

Пракофій Оцяпанавіч Раманюк — селянін вёскі Сычова — падтрымлівае прапанову тав. Жалько. Ён гаворыць:

— Я ахвотна падтрымліваю кандыдатуру тав. Багдановіча. Будучы вылучан на работу ў якасці старшыні сельсовета, ён, у выніку праводзімай вялікай палітычна-масавай работы сярод працоўных, дабіўся таго, што сельсовет вышаў у перадавыя па раёну, паспяхова выканаў важнейшыя дзяржаўныя заданні. У дзень выбараў мы ўсе аддадзім свае галасы кандыдатам блока комуністаў і беспартыйных. Гэтым самым мы будзем галасаваць за сваё шчасце, за большавіцкую партыю Леніна—Сталіна.

Селянін в. Аматы Стасюк Антон Еўціхіевіч заявіў:

— Я ведаю т. Багдановіча як вернага работніка. Доблесная Чырвоная Армія, якая вызваліла наш народ з пад уціску паноў, вызваліла т. Багдановіча з фашысцкай турмы. Ён народу не здрадзіць. [illegible] слова ўзяў т. Багдановіч. [illegible] чыры[illegible] серца дзякуе працоўным [illegible]масую яму высокую [illegible]ворыць: [illegible] праўду. [illegible]рода — [illegible] суд памешчыкаў і капіталістаў асудзіў мяне ў [illegible] зняво[illegible] [illegible] кроме аж[illegible] мной [illegible]. Сва[illegible] [illegible] народ [illegible] Совет[illegible] [illegible] больш[illegible] [illegible]ць ве[illegible] [illegible] жыццё [illegible] [illegible]стаяўў [illegible] кандыдатам [illegible] па выбарч[illegible]

Н[illegible] [illegible]учылі кандыдатам [illegible] Совета [illegible] путатам [illegible]ных сялян та[illegible]ук'янчука [illegible]ея Антонавіча і Жалько Пятра Нікіфаравіча.

А. Фамічоў.

На прадвыбарчым сходзе калектыва друкарні імені Варашылава

адзінадушна вылучан кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета старшыня гарадскога Совета

Тав. Салавей Іосіф Мендалевіч

Адразу-ж пасля работы 4 лістапада, друкары, наборшчыкі, пераплётчыкі і служачыя друкарні сабраліся на першы прадвыбарчы сход для вылучэння кандыдата ў дэпутаты ў абласны Совет дэпутатаў працоўных.

— У нас сёння вялікае свята, — гаворыць тав. Клейн. Мы ад свайго калектыва павінны вылучыць кандыдата ў дэпутаты абласнога Совета. Гэта вялікі гонар. Наш калектыў несумненна пашле лепшага адданага совецкай уладзе чалавека сваім дэпутатам у абласны совет.

— [illegible] калекты[illegible] [illegible] депут[illegible] [illegible] Маско[illegible] [illegible] старш[illegible] [illegible] путата[illegible] [illegible] члена [illegible] [illegible] Мендел[illegible] [illegible] Салавей [illegible] Мы ас[illegible] [illegible] пархоўны [illegible] [illegible]ваё давер'е выбарш[illegible]

— Я падт[illegible]маю прапанову тав. Клейна, [illegible]ворыць старшыня заўкома дру[illegible] тав. Шенкман. Таварыш Салавей з'яўляецца членам комуністычнай партыі, той партыі ў якой інтарэсы народа, інтарэсы працоўных вышэй усяго. Кожны з нас ведае тав. Салаўя, ведае яго біяграфію. Ён рабочага, сам у мінулым рабочы.

Увесь калектыў падтрымлівае прапанову тав. Клейна.

Выступіў старэйшы рабочы друкарні тав. Чаратовіч. — Папярэднія таварышы назвалі імя нашага будучага дэпутата. Я далучаюся да іх прапановы. Таварыш Салавей дастойны гэтага вялікага давер'я.

— На прыкладах жыцця нашага горада за адзін год совецкай улады мы бачым, якія гігантскія змены адбыліся на вызваленай зямлі, — гаворыць тав. Ба[illegible]ум.

— Нашы дзеці вучацца ў чыстых утуленных школах, ліквідавана беспрацоўе, мы зажылі новым, радасным жыццём. І кожны з нас ведае, што гэту радасць жыцця нам дала совецкая ўлада. Сёння мы вылучаем кандыдатаў у дэпутаты, гэта значыць сваіх прадстаўнікоў у органы нашай совецкай улады. І я таксама падтрымліваю кандыдатуру таварыша Салаўя Іосіфа Мендалевіча кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета.

З хвалюючай прамовай на яўрэйскай мове выступіў рабочы-пераплётчык тав. Оксенгорн, які таксама прызваў рабочых друкарні падтрымаць кандыдатуру тав. Салаўя.

154 выбаршчыкі аднадушна вылучылі сваім кандыдатам у дэпутаты тав. Салаўя Іосіфа Мендалевіча.

Нарада старшынь і членаў акруговых выбарчых камісій г. Брэста

2 лістапада ў памяшканні 5 сярэдняй школы адбылася нарада членаў акруговых выбарчых камісій і агітатараў г. Брэста, на якой прысутнічала 500 чалавек актывістаў выбарчай кампаніі.

З дакладам аб прадстаячых выбарах выступіў сакратар гаркома партыі тав. Вержбаловіч. Ён расказаў сабраўшымся аб самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі і выдатных правах совецкіх грамадзян. Тав. Вержбаловіч заклікаў прысутных прыняць актыўны ўдзел і ўзорна правесці выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Старшыня гарадской выбарчай камісіі тав. Зарэмба расказаў аб першых кроках работы акруговых выбарчых камісій, аб падрыхтоўцы спісаў выбаршчыкаў і іх абгаворванні. Старшыня горвыканкома тав. Салавей расказаў аб ператварэнні Брэста з горада купцоў і чыноўнікаў у квітнеючы соцыялістычны горад.

Удзельнікі нарады абавязаліся ўзорна падрыхтавацца і правесці выбары.

Ш. М. Оксенгорн.

У Народным Камісарыяце Замежных Спраў

29 кастрычніка англійскі пасол у Маскве п. Крыпс звярнуўся да Народнага Камісара Замежных Спраў тав. Молатава з нотай, у якой брытанскі ўрад выражаў свой пратест супраць [illegible] ўрадам СССР [illegible] пачынатага ходнасці [illegible] неабтарнай [illegible] (уніле [illegible]ўнікоў СССР [illegible] [illegible] [illegible] і Румыніі у г. [illegible] [illegible] як [illegible] тралі[illegible], што [illegible] [illegible] могуць па[illegible] [illegible] дагаворы, і [illegible] захаваць усе свае [illegible] [illegible] звязаныя з гэтым пытан[illegible]

2 лістапада намеснік Народнага Камісара Замежных спраў тав. Вышынскі прыняў англійскага пасла п. Крыпса і ўручыў яму ад імені Совецкага ўрада ноту, у якой урад СССР заяўляе, што ён вымушан прызнаць няправільным адхіленне брытанскага ўрада аб тым, што прызнанне Совецкім урадам неабходнасці стварэння новай Дунайскай камісіі і ўдзел СССР у перагаворах у г. Бухарэсце з'яўляецца нарушэннем нейтралітэта.

Стварэнне Дунайскай камісіі з удзелам СССР, а таксама дзяржаў, размешчаных па Дунаю або бліска да Дуная, з'яўляецца адчуўленнем справядлівасці, нарушанай Версальскім і іншымі дагаворамі, у сілу якіх, пры кіруючай ролі брытанскага ўрада, СССР быў адхілен з саставу, як Міжнароднай, так і Еўрапейскай дунайскіх камісій.

Дунайская камісія, натуральна, павінна быць складзена з прадстаўнікоў дзяржаў, размешчаных па Дунаю або бліска звязаных з Дунаем і карыстаючыхся Дунаем як каналам для тавараабароту (напрыклад, Італія).

Зразумела, што Вялікабрытанія, аддалёная ад Дуная на тысячы кілометраў, не можа быць адносена да ліку такіх дзяржаў.

Зразумела таксама, што пытанне аб саставе Дунайскай камісіі не мае ніякіх адносін да пытання аб нейтралітэце.

Выходзячы з вышэй сказанага, Совецкі ўрад не можа прыняць пратест, заяўлены брытанскім урадам у ноце ад 29 кастрычніка.

М. І. Калінін

АБ КОМУНІСТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ

(Даклад на сходзе партыйнага актыва гор. Масквы 2 кастрычніка 1940 года).

Таварышы! Дваццаць год таму назад, як раз 2 кастрычніка 1920 года, Уладзімір Ільіч Ленін выступіў на III Усерасійскім з'ездзе РКСМ з прамовай аб комуністычным выхаванні. Звяртаючыся да комсамола, ён гаварыў, што наўрад ці наша пакаленне, выхаванае ў капіталістычным грамадстве, ажыццёвіць задачу стварэння комуністычнага грамадства. Гэта задача ляжа па моладзі.

І вось сёння, калі вы апладыравалі, гэтыя словы мімаволі ўспомніліся мне і навялі на мысль, што перада мной іменна тыя былыя комсамольцы, той слой людзей, да якіх звяртаўся Ленін і якія зараз, ужо як дарослыя, атрымаўшы вопыт жыцця, актыўна ўдзельнічаюць у соцыялістычным будаўніцтве. І я разам з вамі апладырую іменна гам— будаўнікам соцыялізма.

Комуністычнаму выхаванню ў нас удзяляюць многа ўвагі. Недарма слова „выхаванне" отракаюць у нашым друку.

Аднак, калі паспрабаваць больш ці менш чотка і коратка сфармуліраваць, што такое навогул выхаванне, то сустракаюцца значныя цяжкасці. Нярэдка выхаванне змешваюць з навучаннем. Зразумела, выхаванне мае вялікае падабенства з навучаннем, але ні ў якім выпадку не сінонім. Аўтарытэтныя педагогі лічаць, што выхаванне—паняцце больш шырокае, чым навучанне. Яно мае свае асаблівасці.

Па-мойму, выхаванне ёсць пэўнае, мэтаімкнёнае і сістэматычнае ўздзеянне на псіхалогію выхоўваемага, каб прывіць яму якасці, пажаданыя выхавальніку. Мне здаецца, што такая фармуліроўка (зразумела, ні для каго абавязковая) у агульных рысах ахоплівае ўсё, што мы ўкладваем у паняцце выхавання, як напрыклад унядрэнне пэўнага светапогляду, маральнасці і правілаў чалавечага агульнажыцця, выпрацоўку пэўных рысаў характару і волі, прывычак і густаў, развіццё пэўных фізічных уласцівасцей і т. п.

Справа выхавання з'яўляецца адной з цяжэйшых. Лепшыя педагогі лічаць яе не толькі справай навукі, але і мастацтва. Яны маюць на ўвазе выхаванне школьнае, зразумела, параўнаўча абмежаванае. Але ёсць яшчэ школа жыцця, у якой адбываецца нясупынны працэс выхавання мас, дзе выхавальнікам з'яўляецца само жыццё, дзяржава, партыя, а выхоўваемымі—мільёны дарослых людзей, розных па сваёму жыццёваму вопыту, палітычнаму вопыту. Гэта справа куды больш складаная.

На гэтым іменна выхаванні, на выхаванні мас, я і хачу сёння спыніцца.

I.

[illegible] „Анты-[illegible], свядо-[illegible] свае [illegible] тковым [illegible] свайго [illegible] эка-[illegible] рчасці і абману... [illegible] ўсёды [illegible] праў-[illegible] пану-[illegible] класа або адлюстроўвала абурэнне прыгнечанага, але да-статкова ўзвыш[illegible] класа супроць гэтага [illegible] раньш будучы[illegible] ночаных".

Такім чыном [illegible] ным грамадстве ніколі [illegible] ло і не можа быць паваклас[illegible] а або надкласавага выхавання.

У буржуазным грамадстве выхаванне наскрозь прасякнута крывадушшам, карыслівымі інтарэсамі пануючых класаў, яно носіць глыбока супярэчлівы характар, які адлюстроўвае антаганізм капіталістычнага грамадства.

Ідэяй капіталістаў — бачыць рабочых і сялян сваімі пакорнымі слугамі, пярпліва цалучымі цяжар эксплуатацыі. Зыходзячы з гэтага, капіталісты не хацелі-б выхоўваць у рабочых і сялянах смеласць і мужнасць, не хацелі-б даваць ім ніякай асветы. Бо з цёмнымі і забітымі людзьмі лягчэй спраўляцца. Але з такімі людзьмі нельга перамагаць у захватніцкіх войнах, а без элементарных ведаў яны не могуць працаваць на машынах і станках. Узаемная канкурэнцыя ва ўмовах тэхнічнага прагрэса, гонка ўзбраенняў і т. д., з аднаго боку, барацьба рабочых і сялян за сваю асвету, з другога боку, вымушае буржуазію даваць працоўным хоць-бы крохі ведаў, а грабежніцкія войны прымушаюць яе выхоўваць у іх стойкасць, храбрасць і іншыя небяспечныя для буржуазіі якасці.

З гэтых супярэчнасцей не можа выскачыць ніякая сістэма буржуазнага выхавання.

І вось, не гледзячы на гэтыя супярэчнасці, закладзеныя, як я ўжо гаварыў, у самой прыродзе буржуазнага грамадства, пануючыя класы вядуць адчайную барацьбу за аўладанне народнымі масамі, скарыстоўваючы ўсе сродкі — ад адкрытага падаўлення да ўтончанага абману.

Працоўны чалавек у буржуазным грамадстве ад нараджэння і да самай смерці знаходзіцца пад пастаянным уздзеяннем мыслей, пачуццяў, прывычак, выгад пануючаму класу. Я [illegible] ляецца па незлічоны[illegible] прымаючы часамі лед[illegible] формы. [illegible]арква, школ[illegible] преса, кіно, тэатр, [illegible] зацыі—усё гэта [illegible] ундрэнн[illegible] жуазна[illegible] прывы[illegible]

Вазьм[illegible] Але бура[illegible] ас дерыкі[illegible] сучасны[illegible] сабе нев[illegible] варатычн[illegible] чан для [illegible] стом[illegible] кі [illegible] к[illegible]

[illegible] выхав[illegible]

Гэт[illegible] шамус[illegible] на ўмацаванне становішча пануючага класа капіталістаў, на прымірэнне прыгнятаемых са сваім становішчам, комуністычная партыя—перадавы атрад пролетарыята—процістаўляе свае прынцыпы выхавання, накіраваныя ў першую чаргу супроць панавання буржуазіі, за дыктатуру пролетарыята.

II.

Комуністычнае выхаванне ў корані адрозніваецца ад буржуазнага не толькі сваімі задачамі, што зразумела і без доказаў, але і метадамі. Комуністычнае выхаванне неразрыўна звязана з развіццём палітычнага сазнання, агульнай культуры, павышэннем інтэлектуальнага ўзроўню мас. Гэтага дабіваюцца ўсе комуністычныя партыі.

Хоць канчатковая мэта ўсіх комуністычных партый адна і тая-ж, усё-такі, паколькі становішча рабочага класа ў Совецкім Саюзе іншае, чым у капіталістычных краінах, выхаванне ў нас павінна адпавядаць іменна гэтым іншым умовам. Рабочы клас у нашай краіне з'яўляецца пануючай, кіруючай сілай не толькі ў матэрыяльных, але і ў духоўных адносінах.

Марксі і Энгельс пісалі: „Клас, які мае ў сваім распараджэнні сродкі матэрыяльнай вытворчасці, у сілу гэтага мае і сродкі духоўнай вытворчасці... індывіды, складаючыя пануючы клас, уладаюць, між іншым, таксама і сазнаннем і, у сілу гэтага, мыслянь; у той меры, у якой яны пануюць іменна як клас і вызначаюць даную гістарычную эпоху на ўсім яе працяжэнні, яны, само сабой зразумела, робяць гэта ва ўсіх яе галінах, значыць пануюць таксама і як мыслячыя, як вытворцы мыслей, рэгулююць вытворчасць і размеркаванне мыслей свайго часу, а гэта значыць, што іх мысліі ёсць пануючыя мысліі эпохі".

Гэтага нельга сказаць аб рабочым класе па той бок Совецкага Саюза.

Комуністычнае выхаванне ў нашым разуменні заўсёды мысліцца канкрэтна. У нашых умовах яно павінна быць падпарадкавана задачам, стаячым перад партыяй і совецкай дзяржавай. Асноўная і галоўная задача комуністычнага выхавання—даваць максімальную дапамогу ў нашай класавай барацьбе.

Я бачу, вы крыху здзіўлены, хочаце асмысліць становішча—выхоўваць у людзей імкненне аказваць максімальную дапамогу класавай барацьбе ў нашай краіне, дзе эксплуататарскія класы знішчаны. Мне здаецца, тут не патрабуецца асобых раз'яснення. Дастаткова напомніць вам аб выдатным адказе таварыша Сталіна комсамольцу Іванову. „...Паколькі, —пісаў таварыш Сталін, мы жывем не на востраве, а „ў сістэме дзяржаў", значная частка якіх варожа адносіцца да краіны соцыялізма, стварэнне небяспеку інтэрвенцыі і рэстаўрацыі, то мы гаворым адкрыта і чэсна, што перамога соцыялізма ў нашай краіне не з'яўляецца яшчэ канчатковай". Падзеі апошняга года на практыцы, канкрэтнымі фактамі пацвер[illegible] дзілі мысліі, ізложаныя ў гэтым адказе таварыша Сталіна.

Праўда, наша класавая барацьба мае другія формы, чым класавая барацьба за прадзеламі СССР. Яна, я сказаў-бы, падняслася на вышэйшую ступень; яе станоўчыя рэзультаты эфектыўней. Але, зразумела, яна і больш складаная.

Палажэнне Маркса і Энгельса аб тым, што „мысліі пануючага класа ёсць пануючыя мысліі", [illegible] ня[illegible] е комуні[illegible] і ёсць [illegible] ючы, прынцыпова [illegible] параўнанні з тым, [illegible] аб чым гаво[illegible] Ленін на III з'ездзе комсамола 20 год таму назад?

Вядома, абстаноўка ў Совецкім Саюзе за гэты час значна змянілася. Але па сутнасці задачы комуністычнага выхавання, пастаўленыя Леніным 20 год таму назад, актуальны і для данага часу.

Не дрэнна было-б часцей напамінаць гэтыя задачы тым, хто стараецца абстрактна ўзнавіць рысы комуністычнага грамадства. Такія любіцелі „патэарэтызіраваць", памарыць „глыбокамысленна" аб своеасаблівых рысах будучага чалавека, асацыіруючы комунізм з неакрэслена добрым будучым, укладваюць і ў комуністычнае выхаванне гэтую адцягненасць. Па-мойму, гэта гаданне на кафейнай гушчы, а не практычнае ў будучае.

Таварышы, адным з важнейшых элементаў комуністычнага будаўніцтва і магутнай зброяй працоўных СССР у іх барацьбе з капіталізмам з'яўляецца высокая прадукцыйнасць працы. Ленін гаварыў: „Прадукцыйнасць працы, гэта ў канчатковым выніку, самае важнае, самае галоўнае для перамогі новага грамадскага ладу. Капіталізм стварыў прадукцыйнасць працы, невядомую пры прыгонніцтве. Капіталізм можа быць канчаткова пераможан і будзе канчаткова пераможан тым, што соцыялізм стварае новую, значна больш высокую прадукцыйнасць працы... Комунізм ёсць вышэйшая, супроць капіталістычнай, прадукцыйнасць працы добраахвотных, свядомых, аб'еднаных, скарыстоўваючых перадавую тэхніку, рабочых".

Вось, таварышы, аб чым трэба думаць і гаварыць, вось у якім напрамку перш за ўсё, трэба развіваць комуністычнае выхаванне. Гэта—барацьба за высокую прадукцы[illegible] працы.

Але [illegible] з'яўляецца такая ўста[illegible]ўка, [illegible] ны напрамак [illegible] комуністычным выхаванні, [illegible] ім, [illegible] ёй здзіўлены? Не, таварышы, гэта не [illegible] цца.

Калі я, абіраючыся [illegible] мысліна намеціў яго [illegible] му, то [illegible] да бокавых крыніц і, [illegible] чаргу, [illegible] нашай Канстыт[illegible]. Там у арты-куле 12 запісана: „[illegible] ў СССР з'яўляецца абавязкам [illegible] чэсці кожнага здольнага да[illegible] цы грамадзяніна па прынцыпу: „хто не працуе, той не ёсць".

У СССР ажыццяўляецца прынцып соцыялізма: ад кожнага па [illegible] здольнасці, кожнаму — па яго працы". А вы самі ведаеце, таварышы, што артыкулы Канстытуцыі з'яўляюцца не толькі юрыдычным афармленнем правоў і абавязкаў грамадзян, але і магутным фактарам выхавання людзей.

Гэты артыкул Канстытуцыі прама гаворыць аб велічы працы. Яно і зразумела: у нас даўно — як адзначаў таварыш Сталін — адбываецца карэнны пераварот у поглядах людзей на працу. Соцыялістычнае спаборніцтва „перавярае працу з заворнага і цяжкага ярма, якім яна лічылася раней, у справу чэсці, у справу славы, у справу доблесці і геройства". Гэты факт і знайшоў сваё яркае, сталінскае выражэнне ў Канстытуцыі.

Але мне скажуць: адна справа —веліч працы ў нашай краіне, а другая справа — барацьба за вышэйшую прадукцыйнасць працы. Не, таварышы, гэта не так. Самая трактоўка пытання аб велічы працы мае і той сэнс, што трэба ўсяляк заахвочваць рост прадукцыйнасці працы. У гэтым заключаецца самае галоўнае.

Гэтай задачы падпарадкаваны такія важныя мерапрыемствы партыі і совецкай улады, як устанаўленне ордэна „Трудовое Красное Знамя", медалей „За трудовую Доблесть" і „За трудовое отличие". А апрача таго, совецкая ўлада і партыя пярэдка ўзнагароджваюць асоба адзначаўшыхся ў працы такім вышэйшым знакам адрознення, як „Орден Ленина", або ордэнамі „Красная Звезда" і „Знак Почета".

Высокае званне „Герой Соцыялістычнай працы" прыраўніваецца да звання „Герой Совецкага Саюза". Гэта званне, гэтыя ордэны і медалі даюцца не проста за працу, не проста за тое, што чалавек працуе, а за вышэйшыя паказальнікі прадукцыйнасці працы, за асобыя поспехі ў барацьбе за прадукцыйнасць працы.

Той-жа мэце служыць і Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня 1940 года.

Па знешнасці гэта як-быццам [illegible]ная процілегласць: з аднаго [illegible], прысваенне звання „Герой Соцыялістычнай Працы", узнагароджанне ордэнамі, пачынаючы з „Ордэна [illegible] канчаючы ме-далямі, [illegible] ку, [illegible] каз [illegible] а [illegible] г-[illegible] ей: [illegible] ць [illegible]

для дасягнення адных і тых-жа рэзультатаў.

Заахвочваючы і ўзнагароджваючы лепшых прадстаўнікоў соцыялістычнай працы, з аднаго боку караючы дэзарганізатараў вытворчасці, з другога боку, партыя і совецкая ўлада тым самым паказваюць, у якім напрамку трэба весці комуністычнае выхаванне працоўных СССР.

Таварышы, напэўна, нямногія з вас працавалі на заводах у дарэволюцыйны час. З кожным годам такіх людзей у нас становіцца ўсё менш і менш. Таму, трэба думаць, вы слаба ведаеце адносіны да работы ў стары, дарэволюцыйны час. А-нажаль, гэтыя адносіны яшчэ моцна даўлеюць над намі.

Старыкоў, працаваўшых па 40 год на заводзе, добрых прафесіяналаў, мы, революцыянеры, тады не асабліва цанілі. А яны-ж былі кваліфікаванымі работнікамі, знатакамі сваёй справы, прыхільнікамі дысцыпліны ў працы, не прагульвалі. І калі, бывала, узнікала забастоўка, то іх насільна прыходзілася выпіраць з завода. Самі яны не рашаліся спыняць работу, баючыся сапсаваць добрыя адносіны з начальствам. Мы не пачілі такіх рабочых у стары час. Чаму? Таму, што яны стараліся для капіталістаў.

Другая справа зараз, пры соцыялізме. Зараз такіх людзей, якія прапрацавалі на заводзе 40 год, якія прадстаўляюць сабой узор працоўнай дысцыпліны, з'яўляцца знатакамі сваёй справы і даюць вышэйшыя паказальнікі прадукцыйнасці працы, — такіх людзей мы падымаем на шчыт, узнагароджваем ордэнамі і медалямі, ушаноўваем і прэміруем, як лепшых совецкіх грамадзян.

Вось, між іншым, вам наглядны прыклад дыялектыкі. Раней мы адмаўлялі такія адносіны да працы. Цяпер мы „адмаўляем" гэта „адмаўленне". Атрымліваецца, як бачыце, „адмаўленне адмаўлення", уцвярджэнне соцыялістычных адносін да працы.

Чаму мы ў корані змянілі свой погляд на такіх работнікаў? Чаму зараз мы лічым такіх людзей карысніейшымі, каштоўнейшымі грамадзянамі Совецкага Саюза? А таму, што яны стаяць на перадавых пазіцыях у нашай класавай барацьбе, дасягнуўшай вышэйшай ступені свайго развіцця. Класавую-ж барацьбу нельга разумець толькі як схватку са зброяй у руках на фронце. Не, класавая барацьба цяпер ідзе па другіх напрамках. І барацьба за вышэйшую прадукцыйнасць працы — гэта, у даны момант, адно з галоўных напрамкаў класавай барацьбы. Калі раней, да совецкага ладу, чалавек працаваў добра, то тым самым ён аб'ектыўна дапамагаў капіталізму, яшчэ мацней закоўваў ланцугі работва на самім сабе і на рабочым класе ў цэлым. А калі зараз, у соцыялістычным грамадстве, чалавек працуе добра, то гэтым самым ён становіцца на бок соцыялізма і сваімі дасягненнямі не толькі расчышчае шлях да комунізма, але і разбівае ланцугі работва суветнага пролетарыята. Ён з'яўляецца актыўным байцом за комунізм.

Ці намнога мы падняслі прадукцыйнасць працы ў нашай краіне? Я не сказаў-бы, што мы дабіліся вельмі вялікіх рэзультатаў у гэтых адносінах. Тэарэтычна лічыцца, што соцыялістычная прадукцыйнасць працы павінна намнога перавышаць капіталістычную. Як вы думаеце, таварыш Шчэрбакоў, верна гэта ці не? (Шчэрбакоў: „Правільна, правільна". У залі ажыўленне). А практычна? А практычна мы яшчэ не дагналі вышэйшую прадукцыйнасць працы ў Еўропе, не гаворачы аб Амерыцы. Значыць, трэба набольш налягаць на павышэнне прадукцыйнасці працы. Рост прадукцыйнасці працы даць магчымасць яшчэ бачыць ачэртанні будучага комуністычнага грамадства.

Але, таварышы, вышэйшая прадукцыйнасць працы — гэта не толькі колькасць, але і якасць выпрацоўваемай прадукцыі. У нас некаторыя людзі схільны разглядаць комунізм нешта адцягнена, не ўкладваючы ў гэтае паняцце канкрэтнага зместу. А што значыць комунізм? Гэта значыць: давай як можна больш прадукцыі і як можна лепшай якасці! Пры гэтым я маю на ўвазе прадукцыю не толькі фізічнай, але і інтэлектуальнай працы — прадукцыю інжынер[illegible] саў, пісьменнікаў, на[illegible] чоў, арты-стаў, мас[illegible] антаў, спе-ракоў і т. [illegible]

Трэба пр[illegible] ць, што мы вельмі незда[illegible] многіх нашых пра[illegible] ктарна тое, што к[illegible] ца, калі атрымліва[illegible] -небудзь падобна[illegible] так самі мы пры[illegible] адумва-ем[illegible] мі-[illegible] заюць ад нас іншыя людзі. Словам, кожны з нас хоча, каб усяго было ўдосталь і добрай якасці. А я пытаю вас: адкуль гэта ўзяць, калі кожны на сваім месцы не будзе дабівацца лепшых паказальнікаў працы? Трэба, нарэшце, усвоіць старую ісціну: што пасееш, тое і пажнеш.

І тут, у барацьбе за якасць прадукцыі, мы таксама не абмяжоўваемся адными толькі мерамі заахвочвання. Як вы ведаеце, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 ліпеня 1940 года ўстаноўлена, што „выпуск недобраякаснай або некамплектнай прамысловай прадукцыі і выпуск прадукцыі з нарушэннем абавязковых стандартаў з'яўляецца процідзяржаўным злачынствам, роўназначным шкодніцтву". Дырэктары, галоўныя інжынеры і начальнікі аддзелаў тэхнічнага кантролю прамысловых прадпрыемстваў, вінаўныя ў выпуску недобраякаснай або некамплектнай прадукцыі, падлягаюць адданню суду і па прыгавору суда павінны падвергацца турэмнаму зняволенню тэрмінам ад 5 да 8 год.

Няма чаго і гаварыць, гэты Указ вельмі моцна закранае асобных людзей, моцна іх б'е за недобраякаснасць прадукцыі. Але разам з тым ён дае кіраўнікам прадпрыемстваў моцную зброю ў барацьбе супроць нездаровага ўплыву акружэння. Звычайна-ж як разважалі многія з іх? Яны разважалі: ну, ці варта заводзіць скандалы, абвастраць адносіны з грамадскімі арганізацыямі, з таварышамі і т. д. — у масе сыйдзе рэч і з дэфектам. І сыходзіла. Такія адносіны да браку пусцілі ў нас на вытворчасці глыбокія карэнні.

Гэтыя вось карэнні і трэба падсякаць, знішчаць. Гэта неабходна ў інтарэсах соцыялістычнага грамадства і кожнага з нас паасобку. Адно з двух: або мы будуем комунізм, або мы толькі гаворым аб комунізме, а самі пэвольна, калі можна так сказаць, уразвалку, пацягваючыся і пазяхаючы, рухаемся да комунізма. Але майце на ўвазе, што так рухацца да комунізма, вельмі рызкавана, так можна залішне зацягнуць пераход да комунізма.

Калі людзі гаворацць аб комунізме і ў той-жа самы час не звязваюць комунізм прадметна, матэрыяльна, з такімі жыццёва-пачучымі пытаннямі, як пытанне аб якасці прадукцыі, то яны займаюцца проста таўчэннем вады ў ступе.

Памятаю, як зараз, — гэта было год 40 таму назад, можа быць 39—38 год, як бачыце, мая даўнасць часу верніцца каля 40 год (смех), — у нас у падполлі ўзнікла дыскусія: абавязан ці неабавязан рабочы - революцыянер добра рабіць рэчы, г. зн. клапаціцца аб якасці сваёй прадукцыі. Адны гаварылі: мы не можам, арганічна не можам выпусціць з сваіх рук дрэнную рэч — гэта нам прыкра, гэта ўніжае наша чалавечае дастоінства. Другія, наадварот, гаварылі: не наша справа непакоіцца аб якасці прадукцыі. Гэта — справа капіталістаў. Мы-ж на іх працуем. Яны ўсёроўна прымусяць нас рабіць рэчы добра. І паколькі капіталісты будуць прымушаць нас, пастолькі, гаварылі яны, мы будзем рабіць добрыя рэчы. А сваёй ініцыятывы нам не трэба праяўляць, не трэба стараццца.

Вось, бачыце, таварышы, нават у дарэволюцыйны перыяд, у часы капіталізма, частка рабочых, якія змагаліся з капіталістамі, глядзела на справу так, што нельга рабіць рэчы дрэнна — гэта ім было прыкра, як-бы не дазваляла сумленне. А ў нас, у соцыялістычным грамадстве, калі мы працуем не на капіталістаў, а на самых сябе, — [illegible]ім прыкра, ці ўсе саромяцца рабіць дрэнныя рэчы? На жаль, гэтага нельга сказаць. Аднак, было-б куды лепш, калі-б у людзей было больш сумлення, калі-б ім больш прыкра было выпускаць недобраякасную прадукцыю.

І калі мы гаворым аб комуністычным выхаванні, то гэта значыць, перш за ўсё, упядраць у сазнанне кожнага работніка тую мысль, што ён павінен хоць-бы элементарна добрасумленна адносіцца да сваёй работы. Мы павінны ўнушаць яму: калі ты лічыш сябе большавіком або проста чэсным совецкім грамадзянінам, то будзь ласкаў і свае вырабы рабіць элементарна добрасумленна, каб яны былі годны па якасці.

Ітак, барацьба за комунізм — гэта барацьба за вышэйшую прадукцыйнасць працы як у сэнсе колькасці, так і ў сэнсе якасці прадукцыі. Вось нам першая асноўнае палажэнне комуністычнага выхавання працоўных СССР.

(Працяг на 3 старонцы).

М. І. Калінін

АБ КОМУНІСТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ

(Даклад на сходзе партыйнага актыва гор. Масквы 2 кастрычніка 1940 года).

IV.

Таварышы, у артыкуле 131 Канстытуцыі Саюза сказана: „Кожны грамадзянін СССР абавязан берагчы і ўмацоўваць грамадскую, сацыялістычную ўласнасць, як свяшченную і недатыкальную аснову совецкага ладу, як крыніцу багацця і магутнасці радзімы, як крыніцу заможнага і культурнага жыцця ўсіх працоўных.

Асобы, якія пасягаюць на грамадскую, сацыялістычную ўласнасць, з'яўляюцца ворагамі народа".

Берагчы і ўмацоўваць грамадскую ўласнасць — гэтае пытанне па сваёй унутранай значымасці большае, чым здаецца знешне. Беражлівасць да грамадскай уласнасці ёсць комуністычная рыса. Мне прадстаўляецца, што ў гісторыі чалавецтва не было больш беражлівага грамадства, чым комуністычнае. Ды гэта і натуральна: бо распараджэнне сродкамі, іх расходаванне толькі ў комуністычным грамадстве знаходзіцца ў руках вытворцаў. Я думаю, няма асобай патрэбы даказваць, што вытворца больш эканомны ў расходаванні, чым эксплаататар або захватчык чужога дабра.

Гісторыя не прывучыла людзей берагчы грамадскую ўласнасць, а любіцеляў раскрадваць гэтую ўласнасць заўсёды было дастаткова. Казнакрадства было характэрнай рысай ранейшай сістэмы кіравання, а казна была дойнай каровай для чыноўнікаў. Зразумела, такія парадкі развівалі бесклапотнасць, матаўство і ў адносінах асабістай маёмасці, а пагарда да грамадскай маёмасці была зверху данізу.

Але гэтае раскрадванне народнага здабытку, чалавечай працы, якое мы назіралі ў мінулым, з'яўляецца не больш як дзіцячай шаласцю ў параўнанні з тым, як раскрадваецца чалавечая праца ў сучасным капіталістычным грамадстве. Можна смела сказаць, што цяпер кожны дзень пускаюцца на паветра мільёны працадзён з тым, каб зруйнаваць працу мінулага. А колькі знішчаецца каштоўнейшых дараў прыроды, колькасць якіх абмежавана на зямлі! Ужо толькі за адно гэта злачынства перад чалавецтвам капіталізм заслугоўвае хутчэйшага знішчэння.

Беражлівасць у агульным балансе дзяржаўнай вытворчасці з'яўляецца плюсавай часткай народнага здабытку. І гэтая частка павінна з года ў год расці, як рэзультат павышэння нашай культурнасці.

Таварышы, артыкул 131 Канстытуцыі дае багацейшы матэрыял для комуністычнага выхавання. Ён накіраван супроць буржуазнага погляду: „дом мой—больш ведаць нічога не хачу, у маё бомбасховішча нікога не пушчу". Ён абавязвае берагчы грамадскую ўласнасць, ставіць агульныя інтарэсы вышэй асабістых, індывідуальных, бо толькі ў калектыве, у сацыялістычным грамадстве сапраўды гарантыруецца становішча кожнага.

Ленін яшчэ на першым годзе існавання совецкай улады гаварыў: „Вядзі акуратна і добрасумленна ўлік грошай, гаспадарнічай эканомна, не лодырнічай, не крадзі, захоўвай стражэйшую дысцыпліну ў працы— іменна такія лозунгі, якія справядліва асмейваліся рэвалюцыйнымі пролетарыямі тады, калі буржуазія прыкрывала падобнымі гутаркамі сваё панаванне, як класа эксплаататараў, становяцца цяпер, пасля звяржэння буржуазіі, чарговымі і галоўнымі лозунгамі моманту".

Што датычыць зладзеяў, раскрадальнікаў грамадскай уласнасці, жулікаў і таму падобных „хавальнікаў традыцый капіталізма", то супроць іх мы павінны накіраваць карныя меры. Гэтым мэтам служыць, у прыватнасці, пастанова ЦВК і Соўнаркома СССР ад 7 жніўня 1932 года „Аб ахове маёмасці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў і кааперацыі і ўмацаванні грамадскай (сацыялістычнай) уласнасці" і Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 жніўня 1940 года „Аб крымінальнай адказнасці за дробныя крадзяжы на вытворчасці і за хуліганства".

Ітак, таварышы, нам трэба спачатку навучыцца працаваць па здольнасцях, навучыцца берагчы грамадскае дабро, а калі мы дастаткова напрацуем і навучымся берагчы напрацаванае, тады пусцім усё па патрэбнасці.

Гэта ёсць другая састаўная частка комуністычнага выхавання.

V.

Неабходным састаўным элементам комуністычнага выхавання з'яўляецца таксама развіццё любві да радзімы, да сацыялістычнай радзімы, развіццё совецкага патрыятызма.

Упершыню слова „патрыёт" паявілася ў перыяд французскай рэвалюцыі 1789—93 гг. Патрыётамі тады называлі сябе барацьбіты за народную справу, абаронцы рэспублікі ў процівагу здрадлікам, прадаўцам радзімы з лагера манархістаў.

Але потым гэты тэрмін быў скарыстан рэакцыянерамі і правячымі вярхамі ў сваіх карыслівых мэтах. Таму да слова „патрыятызм" як у Еўропе, так і ў царскай Расіі найбольш чесныя людзі, якія непакоіліся аб народных патрэбнасцях, заўсёды адносіліся падазрона, бачачы ў ім нацыянальны шавінізм, неабгрунтаваную самаўпэўненасць правячых вярхоў. Нарэшце, пад гэтым флагам царскія сатрапы грабілі далучаемыя народы.

Манаполію на „патрыятызм" захапілі чорнасоценцы, якія дэманстравалі свае „патрыятычныя пачуцці" у вулічных пагромах, у збіванні рабочых, інтэлігенцыі, яўрэяў. І наогул да гэтага „патрыятызма" рабіла тады многа ўсякіх цёмных, авантурыстычных элементаў з падонкаў грамадства.

У вачах народа апаганілася слова „патрыятызм". Чэсному чалавеку было немагчыма прылічваць сябе да „патрыётаў".

Народы, далучаныя да Расіі, прыгнятаемыя, эксплаатуемыя, абіраемыя і зневажаемыя на кожным кроку чыноўнікамі і каланізатарамі, вядома, ненавідзелі рускую дзяржаву.

Як-бы ў процівагу „патрыятызму" рыцараў кнута і бізуна ішоў усё нарастаючым тэмпам прагрэсіўны рух, накіраваны сваім астрыём супроць самадзяржаўя.

Спачатку барацьба прагрэсіўных сіл з рэакцыяй захапіла літаратуру, музыку, жывапіс, дзе можна было, па крайняй меры, намёкамі выражаць свае ўмоўныя адносіны да тагочаснай рэчаіснасці. З цягам часу ў гэту барацьбу пачалі паступова ўцягвацца дэмакратычныя слаі насельніцтва, даючы чаму яна прымала ўсё больш рэвалюцыйны характар. Ды працэс расціў і згуртоўваў [illegible] ашуўнікаў самадзяржаўя, прашу[illegible] ў так званай афіцыяльнай Расіі. У той-жа час ён ствараў нацыянальны аплот вялікага народа ў асобе яго лепшых прадстаўнікоў. Паявілася цэлая плеяда геніяльных і адароных пісьменнікаў, крытыкаў і публіцыстаў, якія высока падняслі і праславілі нашу літаратуру, зрабілі яе сусветнай. І не толькі літаратуру, але і руская музыка, жывапіс, навука сталі вылучаць сваіх бліскучых прадстаўнікоў, як сапраўдных патрыётаў нацыянальнай культуры.

Гэтыя людзі, дарожыўшыя сваёй чэсцю, чалавечым дастоінствам і грамадскай рэпутацыяй, рашуча адмяжоўваліся ад квасного афіцыяльнага „патрыятызма". Для іх вышэй за ўсё было служэнне свайму народу і прабуджэнне ў ім сапраўднага патрыятызма. Дзеля гэтай вялікай мэты, яны не шкадавалі сваіх сіл і дараванняў. У іх вучыліся, пераймалі іх прыклад і заражаліся высокім патрыятызмам сучаснікі і наступныя пакаленні. Глыбока патрыятычная дзейнасць гэтых людзей складае намала яркіх і захапляючых старонак у гісторыі рускага народа. І калі яны не карысталіся сімпатыямі афіцыяльнай Расіі, то народ, наадварот, аддаваў ім належную павагу, заўсёды ўшаноўваў і будзе ўшаноўваць светлую памяць аб іх.

Вось гэты працэс барацьбы прагрэсіўных сіл з рэакцыйнымі, гэты працэс росту і кансалідацыі культурных сіл даў магчымасць, па крайняй меры, найбольш свядомым элементам прыгнечаных нацыянальнасцей убачыць другую Расію—Расію благародную, свабодалюбівую, непрыгнятацельскую, культурную, таленавітую, садзейнічаючую развіццю ведаў сярод шырокіх мас насельніцтва. Разгарвуўшыйся рабочы рэвалюцыйны рух паставіў на чаргу дня, як актуальную задачу, сапраўднае згуртаванне пролетарыяту і працоўных усіх нацыянальнасцей Расійскай імперыі ў іх барацьбе супроць царызма і капіталізма. Намаганні Леніна і [illegible] ствараванню ўсе[illegible] рабочага класа [illegible] Расіі[illegible] было вы[illegible] народа і прыг[illegible] нацыянальнасцей, [illegible] левінскай [illegible] сталі[illegible] барацьба бол[illegible] палітычнай, [illegible] супроць [illegible] самадзяржаўя [illegible] Расіі [illegible] ўнутрана [illegible] ваага [illegible] ала [illegible] прыгнечання нацыянальнасці з рускім народам, прымушала найбольш свядомыя іх элементы знаёміцца з рускай літаратурай, мастацтвам, навукай, з рускімі рэвалюцыйнымі барацьбітамі і тым самым далучала іх да рускай культуры, рабіла іх старонніка мі агульнай, злітнай барацьбы, г. зн. людзьмі, мыслячымі ўжо ўсерасійскі.

Пропаведзь совецкага патрыятызма не можа быць адарванай, не звязанай з карэннямі мінулай гісторыі нашага народа. Яна павінна быць поўна патрыятычнай гордасці за дзеянні свайго народа. Бо совецкі патрыятызм з'яўляецца прамым наследнікам творчых спраў продкаў, рухаўшых уперад развіццё нашага народа.

Совецкае жыццё гэта надзвычай ярка ілюструе. Дастаткова ўказаць хоць-бы на адзін факт. З якім захапленнем раскаваныя народы аднаўляюць у памяці вобразы сваіх эпічных і гістарычных герояў. Яны адлюстроўваюць іх у сваіх лепшых мастацкіх творах, якія вязуць на паказ у Маскву — серца совецкіх рэспублік, дзе кожны з іх хоча як-бы сказаць усім народам СССР: глядзіце, я з'яўляюся не з чыёйсьці міласці членам вялікага саюза народаў, я не чалавек без роду і племені,—вось мая радаслоўная, якой я гарджуся, і хачу, каб і вы, мае браты па працы і па абароне лепшых ідэалаў чалавецтва, палюбаваліся маёй радаслоўнай!

Значыць, совецкі патрыятызм бярэ свае вытокі ў глыбокім мінулым, пачынаючы ад народнага эпаса; ён упітвае ў сябе ўсё лепшае, створанае народам, і лічыць найвялікшай чэсцю берагчы ўсе яго дасягненні.

Вялікая пролетарская рэвалюцыя не толькі зрабіла велізарныя разбурэнні, але і паклала пачатак небачанай творчай рабоце. Разам з тым яна прайшла магутным ачышчальным ураганам у галовах дзесяткаў мільёнаў людзей, усяліўшы ў іх бадзёрасць і веру ва ўласныя сілы. Цяпер яны адчулі сябе багатырамі, здольнымі перамагчы ўвесь свет, варожы працоўным масам.

І вось зарадзіўся ўжо совецкі эпас, які з'еднаў лінію народнай творчасці далёкага мінулага і нашай эпохі, абарваную капіталізмам, які варожы гэтай галіне духоўнай вытворчасці. Разгарнуўшыйся працэс сацыялістычнага пераўтварэння грамадства высунуў мноства багатых і захапляючых тэм, дастойных кісці вялікіх мастакоў. Народ ужо адбірае з гэтых тэм лепшыя зёрны і паступова стварае асобныя зарысоўкі для эпіка-гераічных паэм пра вялікую эпоху і яе вялікіх герояў, як Ленін і Сталін.

Ад народа не павінны адставаць нашы таленавітыя літаратары і мастакі. Во ніколі яшчэ не было для іх столькі і такога ўдзячнага матэрыялу, як у нашу эпоху. Толькі цяпер яны маюць неабмежаваную магчымасць служыць свайму народу і ўнядраць у масы глыбокія пачуцці патрыятызма на аснове вялікіх дзеянняў сучасных пакаленняў.

Мне здаецца, выдатным узорам служэння совецкаму народу з'яўляецца Маякоўскі. Ён лічыў сябе байцом рэвалюцыі і быў такім па сутнасці сваёй творчасці. Ён імкнуўся зліць з рэвалюцыйным народам не толькі змест, але і форму сваіх твораў, так што будучыя гісторыкі наверняка скажуць, што яго творы належалі вялікай эпохе ломкі чалавечых адносін. Таму я лічу, што Маякоўскі меў права, звяртаючыся да будучых пакаленняў, сказаць:

„Я к вам прыду
в коммунистическое далеко не так,
как песенно-есенинный провинтязь.
Мой стих дойдет
через хребты веков
и через головы
поэтов и правительств.
Мой стих дойдет,
но он дойдет не так, —
не как стрела
в амурно-лировой охоте,
не как доходит
к нумизмату отчеканенный
пятак и не как свет умерших
звезд доходит.
Мой стих
трудом
громаду лет прорвет
и явится
весомо,
грубо,
зримо,
как в наши дни
вошел водопровод,
сработанный
римскими рабами Рима".

У гэ[illegible] ордай заяве мы чуем велічны голас нашай эпохі, нашых пакаленняў, пераўтвараючых свет на новых [illegible]чатках.

Таварышы, [illegible]орыя ўсклала на нас адказну[illegible] пачотную задачу—давесці нашу класавую барацьбу да поўнай перамогі комунізма. „Мы павінны рухацца ўперад так, каб рабочы клас усяго свету, гледзячы на нас, мог сказаць: во[illegible] перадавы[illegible] вось яс[illegible] вось [illegible] яна, мая ба[illegible]

А для г[illegible] хаваць усіх прац[illegible] духу палкага патрыятызма, у духу бязмежнай любві да сваёй радзімы. Я гавару не аб адцягненай, не аб платанічаскай любві, а аб любві напорыстай, актыўнай, страснай, неўкрацімай, аб такой любві, якая не ведае ніякай літасці да ворагаў, якая не спыніцца ні перад якімі афярамі ў імя радзімы.

Вось вам трэцяя асноўная задача комуністычнага выхавання працоўных СССР.

VI.

Лічу неабходным спыніцца яшчэ на пытанні аб калектыўнасці. Не патрабуецца асоба даказваць, што ўнядрэнне калектыўнасці павінна займаць віднае месца ў комуністычным выхаванні. Я маю на ўвазе тут не тэарэтычныя асновы калектывізма, а ўнядрэнне ў вытворчасць, у быт, у жыццё грамадскіх навыкаў, стварэнне такіх умоў, пры якіх калектыўнасць складала-б невід'емную частку нашых прывычак, норм паводзін, каб дзеянні гэтыя рабіліся не толькі абдумана, свядома, а выцякалі інстынктыўна, арганічна.

Я гавару аб свядомым культывіраванні такіх навыкаў у народзе.

Паняцце калектыўнасці нельга змешваць з паняццем стаднасці. Напрыклад, калі ў мінулым сялянне натоўпам збівалі канакрада або калі натоўп укладчыкаў лопнуўшага банка, буйствуючы, біў шыбы ў банку — то такія дзеянні, па-мойму, нельга лічыць праяўленнем калектыўнасці. Яны носяць характар стаднасці. Калектыўнасць-жа здзяйсняе метазгоднасць у дзеянні.

Калектыўнасць у практычным жыцці нашага грамадства адыгрывае вялікую ролю, бо яно грунтуецца на базе калектывізма. Мы процістаўляем капіталістычнаму грамадству калектывізм-комунізм, дзе[illegible]ванны ў яго велізарнай перавазе. Ад паспяховасці ўнядрэння калектыўных навыкаў у вытворчасці, грамадскім жыцці і быту залежыць у значнай ступені і паспяховасць комуністычнага будаўніцтва.

Калектыўнасць працы, яе каапераванасць з'яўляецца асновай вытворчасці. У сацыялістычнай прамысловасці гэта не патрабуе асобых доказаў. Тут гэта зразумела сваёй наглядзнасцю рабочым і ўсім, хто звязан з фабрычнай вытворчасцю. Калі ў капіталістычным грамадстве праца асобнага пролетарыя ўсім абязлічваецца і, будучы авешчаствлёнай у прадмеце, прападае з поля зроку не толькі рабочага, але і фабрыканта, якога цікавіць толькі прыбытак, то ў нас авешчаствлёная праца на віду ў рабочага. Яна дэманстрыруецца не толькі на месцы вытворчасці, але і ў спажыванні, у карыстанні. Значыць вытворца пры сярэдняй зоркасці можа бачыць вынікі сваёй працы. Аднак, мы павінны сваёй выхаваўчай работай расшырыць і паглыбіцьу спрыяцце кожным работнікам яго індывідуальнага ўдзелу ў агульнай, калектыўнай працы.

Але асабліва неабходна завастрыць увагу на выхаванні калектыўнасці ў вёсцы, у калгаснай вёсцы. Яна праходзіць сур'ёзную школу калектыўнасці, амаль усім на мачы навыкаў да калектыўнай работы. Хоць у мінулым словы „грамадства", „грамадскія інтарэсы" часамі і гаварыліся на сельскіх сходах, але па сутнасці калектыўнага там было мала. За словамі „грамадскія інтарэсы", „грамадства" рабіліся асабістыя справы кулакоў.

З пераходам на шлях калектывізацыі перад сялянствам сталі цяжкія задачы: наперакор усяму мінуламу зламаць, вярней, накіраваць у процілеглы бок сваю псіхалогію, перайсці з работы на сябе на работу на ўсіх. Гэта працэс нялёгкі і паспяхова развівацца ён мог толькі пад значным націскам і з дапамогаю дзяржавы.

Пераход з індывідуальнай простай працы да калектыўнай, больш высокай і больш складанай працы патрабуе ад людзей куды больш арганізацыйных здольнасцей. І вось, паралельна працэсу зжывання ўласніцкіх нахільнасцей і накаплення ў сялян-калгаснікаў калектывісцкіх навыкаў, ідзе накапленне арганізацыйнага вопыту ў прымяненні калектыўных метадаў работы.

Вось у якіх умовах ідзе комуністычнае выхаванне ў вёсцы.

Вядома, што голы заклік да калектыўнасці, голая агітацыя за яе перавагі перад індывідуальнай работай ужо недастатковы. Прапагандыст, агітатар, выхавальнік павінны ўказаць калгаснікам на больш эфектыўныя спосабы работы або, па крайняй меры, прывесці канкрэтныя прыклады эфектыўнай работы з аналізам прычын яе эфектыўнасці.

Такім чынам, нават такая складаная справа, як выхаванне калектыўнасці, каб быць найбольш эфектыўнай, павінна прыстасоўвацца да практычнай работы. Інакш кажучы, выхаванне калектыўнасці павінна праводзіцца канкрэтна. Раз'ясняючы сэнс таго ці іншага практычнага працэса, выхавальнік адначасова абагачаецца сам практычным матэрыялам для свайго ўласнага тэарэтычнага развіцця. Між іншым, гэта можа служыць наглядным прыкладам адзінства тэорыі і практыкі.

Вось вам чацвёрты элемент комуністычнага выхавання.

VII.

Апладатвараючым фактарам усякай станоўчай работы з'яўляецца культурнасць. Чым больш складаная, кваліфікаваная работа, тым большая патрабуецца культурнасць. Культура нам патрэбна, як паветра, ва ўсім яе шырокім дыяпазоне, г. зн. ад элементарнай, неабходнай літаральна кожнаму чалавеку, да так званай вялікай культуры. Гавораць: чалавек вялікай культуры.

Культурнасць з'яўляецца пэўным паказчыкам ступені развіцця чалавека. А паколькі развіты чалавек карыстаецца большай увагай, то некаторыя пераймаюць знешнія бакі культурнасці. Аб такіх людзях звычайна гавораць: прыбралася варона ў паўлінні пер'і. Аднак, па-мойму, такое разважанне няправільна, шкодна для развіцця культуры. Зразумела, у масе людзі спачатку бяруць знешні бок. Але паколькі чалавек стараецца набыць знешнія бакі культурнасці, яны, у сваю чаргу, уплываюць ужо на падняцце яго агульнай культуры.

Чаму зараз асабліва востра адчуваецца неабходнасць у павышэнні агульнай культурнасці? За дваццаць тры гады совецкага ладу наша эканоміка далёка прасунулася ўперад. Тэхнічны ўзровень вытворчасці стаў куды вышэй, машы[illegible]тані сталі больш [illegible] трабуюць больш [illegible]ронага абыхо[illegible] абіраем адну [illegible] за другой, [illegible]ч: нам [illegible]ныя, [illegible]абой [illegible]вы[illegible]ано[illegible]

[illegible] людз[illegible] насц[illegible] механ[illegible] ча [illegible] раб[illegible] работы, [illegible]еменн[illegible] тарную [illegible]ь ін[illegible] шыя п[illegible]онуха. Параўна[illegible]лянну быць ко[illegible]м-двух коняў. А калі на кавунні 30—40 коней [illegible] патрабуецца ўжо арганізацы[illegible] вопыт [illegible] культурнасці [illegible] як за ўсіх галінах калгас[illegible] гаспадаркі. Каб рухаць[illegible]ца ўперад, патрэбна культура.

Не[illegible] не таксама напомніць і аб пат[illegible]ні з абароны [illegible]. Тут патраб[illegible]ні на [illegible]насць растуць [illegible] па днях, [illegible] гадзінах.

Апрача ўсяго, культурнасць — гэта чыстаплотнасць на вытворчасці і ў быту.

Уявіце сабе, таварышы, інжынера, добрага інжынера. Ён многа вучыўся, адукаваны чалавек, кіруе заводам, лічыцца каштоўным работнікам. А калі ідзеш у яго па заводу, то сам чорт нагу зломіць! (Смех). Ну, хіба гэта культурнасць? Калі такі інжынер не заўважае гэтага, значыць у яго яшчэ няма самай элементарнай культурнасці, значыць ён па-сапраўднаму не хварэе за свой завод, за сваю вытворчасць.

Я разумею барацьбу за культурнасць у самым шырокім сэнсе слова, каб, напрыклад, з крана не цякла вада, каб у Маскве памеж[illegible] было клапоў у кватэрах і т. п. Клапы гэта-ж нецярпімая рэч, гэта ганьба, а людзі ў гэты час задаюць сабе пытанне: якім павінен быць чалавек пры комунізме, якімі ўласцівасцямі ён будзе адзначацца? (Смех) Людзі разглагольствуюць аб выхаванні дзяцей, а ў сябе ў кватэры зрабілі клапоўнік. Ну, што гэта такое! Хіба гэта культурныя людзі? Гэта — дваранскія цюфякі, якія засталіся ад старога рускага грамадства. (Смех).

* * *

Таварышы, можна было-б спыніцца яшчэ на цэлым радзе пытанняў комуністычнага выхавання, як, напрыклад, на ролі партыі, профсаюзаў, комсамола, спартыўных арганізацый, ВНУ, школы, літаратуры, мастацтва, кіно, тэатра, сям'і і т. д. Але гэта завяло-б нас [illegible] а, і мы ўпусцілі-б з п[illegible]боку самае галоўнае, [illegible]ае задачы і змест комун[illegible] выхавання працоўных [illegible] на даным этапе класавай барацьбы.

Я лічу, што тыя асноўныя вехі, аб якіх ішла гутарка, павінны вызначаць падыход да комуністычнага выхавання ўсіх нашых арганізацый і ўстаноў, усіх работнікаў, якія непасрэдна займаюцца гэтай справай. Любое практычнае [illegible]не яны павінны рашаць [illegible] і асн[illegible] меты комуністычнага выхавання.

Калі наша выхаванне будзе па знешнасці выдатным, але абстрактным, г. зн. калі яно не будзе прадметна, матэрыяльна звязана з барацьбой за далейшы рост сацыялістычнай дзяржавы і ўмацаванне яго пазіцыі ў цяперашняй класавай барацьбе, та гэта будзе пародыя на выхаванне.

У сучаснай складанай міжнароднай абстаноўцы [illegible] вінен быць асабл[illegible] падцягнутым і нап[illegible] ёй пільнасці, [illegible] сустрэць любую нечаканасць і ўсякую выпадковасць. У гэту точку павінны біць усе нашы грамадскія арганізацыі, літаратура, мастацтва, кіно, тэатр і т. д. Гэта і будзе, таварышы, сапраўдным выкананнем волі партыі, указанняў таварыша Сталіна і заветаў Леніна па комуністычнаму выхаванню мас у дзень гістарычнага перыяд. (Бурныя апладысменты. Усе ўстаюць).

Майстар цэха сярэдняга рамонту вагонаў Гомельскага вагоннага участка Г. Ф. Лысенка, работаючы цэхавым агітатарам вістэматычна праводзіць палітмасавую работу сярод рабочых.

На здымку: тав. Лысенка чытае газету рабочым, у час абедзеннага перапынку.

Фота І. Ланідуса. Фотахроніка Белта.

212

ЗАГАД

часцям Брэсцкага гарнізона

5 лістапада 1940 г. № 3 гор. Брэст.

§ 1.

У азнаменаванне XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі ў 10 гадзін 7.11.40 г. назначаю парад часцям Брэсцкага гарнізона.

§ 2.

Прымае парад генерал-лейтэнант тав. Чуйкоў.

§ 3.

Камандаванне парадам ускладзена на мяне.

§ 4.

Пастраенне парада і парадак руху часцей з парада ўскладаю на каменданта гор. Брэста маёра тав. Кайтуненка.

§ 5.

Форма адзення часцей удзельнічаючых на парадзе — зімняя каравульная, без процівагазаў.

§ 6.

Падтрыманне парадку ў горадзе ў час парада ўскладаецца на Начальніка абласнога ўпраўлення міліцыі тав. Багацэнка.

Начальнік гарнізона гор. Брэста
генерал маёр ПАПОЎ.

Начальнік штаба гарнізона
маёр Пенчэўскі.

Новая школа ў вёсцы Грабарка

У вёсцы Грабарка, Самяцінскага раёна, закончана будаўніцтва памяшкання начальнай школы. 120 дзяцей працоўных сялян запоўнілі светлыя і прасторныя класы новай школы. У школе працуе 4 настаўнікі.

Вечарам у памяшканні новай школы займаюцца дарослыя, якія ліквідуюць сваю непісьменнасць і малапісьменнасць.

Г. Кожыч.

Фермы не гатовы да зімы

Самяцічы (Ад нашага кар.) Дзвюма рэйсамі партыі абмеркаваў пытанне, як жывёлагадоўчыя фермы калгаса падрыхтаваны да зімы.

З даклада загадчы[illegible] тав Лукашэвіча і [illegible] райкома т. [illegible] і «Сказ[illegible], што да [illegible] жывёлы калгасы раёна не падрыхтаваліся. Не ўцеплены клазы, не вызначаны канцэнтраты, не складзены кармавыя балансы. У калгасах няма адказных людзей за кармавыя фонды.

Аграноміны і зоатэхнічны персанал [illegible] не дапамагае калгасам у [illegible] лепшага догляду жывёлы [illegible] аб выдатным [illegible] жывёлагадоўлі.

У калгасе імені Варашылава на жывёлагадоўчую ферму прабраліся чужыя людзі, якія імкнуцца пашкодзіць кадэктыўнай гаспадарцы. І патрэбна сказаць, што гэта ім удалося. Скарыстоўваючы адсутнасць класавай пільнасці ў праўленні калгаса, яны ўмардзілі 4 каровы, 3 коней і многа парасят. Пракурор ра[illegible] прыцягнуў [illegible]

Акад[illegible]

[illegible] Бюро [illegible] сенна[illegible]

[illegible] Гудкі[illegible] 35-гадо[illegible]

[illegible] ВКП(б) [illegible] з узнагароджаннем ордэнам Леніна. Акадэмік А. Ф. Іофе заявіў, што ён аддасць усе свае сілы і веды далейшаму развіццю савецкай навукі, яшчэ большаму ўмацаванню гаспадарчай і ваеннай магутнасці сацыялістычнай краіны.

Кіяўчанская дастаўляецца

[illegible] газеты [illegible]

(Пісьмо ў рэдакцыю)

Бярэза. Вельмі дрэнна працуе Сядзецкае [illegible] аддаленне. Тут газеты на пошце праляжваюць па некалькі дзён і ўжо устарэўшыя і падчас парваныя даставяцца падпісчыкам.

Г.

На сходзе комсамольскага актыва

Днямі ў памяшканні кінатэатра горада Косава быў назначан раённы сход комсамольскага актыва. Раённы камітэт комсамола рыхтаваўся да гэтага важнейшага мерапрыемства вельмі дрэнна. Аб гэтым яскрава сведчыць такі факт. На сход збіралася марудна. З 97 чалавек з'явілася толькі 35. З комсамольскай арганізацыі вёскі Яглевічы, налічваючай 12 комсамольцаў, не з'явілася ні аднаго чалавека. Работа схода была распачата са спазненнем на 2 гадзіны.

На павестцы дня схода актыва стаялі два пытанні: аб выніках работы XIV з'езда комсамола Беларусі, аб задачах комсамола ў прадстаячых выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных.

З дакладам па першаму пытанню выступіў сакратар РК ЛКСМБ тав. Іўдеў.

З даклада і спрачак магчыма было заключыць як работнікі комсамольцы па вытворчасці, як яны ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці. Вось кароткая характарыстыка. Пасля выбараў лепшых комсамольскіх арганізацый комсамольцы раёна сталі больш энергічна ўдзельнічаць у вытворчай рабоце і ў грамадскім жыцці. Комсамольская арганізацыя сельскагаспадарчай арцелі імені Комінтэрна на-баявому ўзялася за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгаса. На малочнай ферме доўгі час дрэнна абстаяла справа з доглядам за жывёлай, быў вялікі адыход маладняка. Ад кароў атрымлівалі нізкі ўдой. Комсамольцы абгаварылі гэтае пытанне на комсамольскім сходзе і намецілі практычныя мерапрыемствы па догляду за жывёлай. Для работы на ферме арганізацыя вылучыла комсамолку Соню Асіпік. Яна з вялікай ахвотай і жаданнем узялася за справу. У хуткім часе становішча на ферме стала прыкметна паляпшацца.

Добра працуе комсамолец-трактарыст гэтай арганізацыі Пытляк Васіль. За лета ён выпрацаваў больш 250 працадзён. Яго, як лепшага трактарыста, накіравалі на курсы брыгадзіраў-трактарных брыгад.

Добра ўдзельнічаюць у [illegible] ным жыцці калгаса [illegible] цы первічнай арг[illegible] імені Варашыл[illegible]

Аб ролі к[illegible] ыт[illegible] творчасці ор[illegible]

Цэлы год івацэвіцкі лесазавод № 13 не выконваў вытворчага задання. Некаторыя цэхі нават не давалі 50 процантаў патрэбнай прадукцыі. Комсамольцы зацікавіліся прычынамі адставання завода. На сваім сходзе яны шырока абгаварылі пытанне, як вывесці завод з прарыва. Тады было вырашана ў асноўныя цэхі накіраваць комсамольцаў. Так было і зроблена. Комсамольцы з энтузіязмам узяліся за гаспадарчую справу. Завод хутка стаў выконваць план.

Побач з гэтым у рабоце комсамольскіх арганізацый раёна яшчэ многа і адмоўных бакоў. Сур'ёзным недахопам з'яўляецца адсутнасць праверкі выканання комсамольскіх даручэнняў. Такая практыка зачастую прыводзіла да зніжэння адказнасці асобных комсамольцаў за даручаную справу.

У первічнай комсамольскай арганізацыі вёскі Сеньковічы з-за адсутнасці дысцыпліны большасць сходаў праходзіць непадрыхтавана. Комсамольцы тт. Шолест Аляксандр, Хаванскі Іван не наведваюць сходаў, а іх праступак на сходзе не абгаварваўся.

На сходзе рэзкай крытыцы выступаючыя падвергілі работу пастаянна дзейнічаючых камісій пры РК ЛКСМБ. Асабліва рэзка крытыкавалі работу культурна-масавай камісіі (старшыня тав. Соклава). Гэта камісія не правяла ніякай работы па арганізацыі культурнага досуга комсамольцаў і несаюзнай моладзі.

Даклад аб выбарах у мясцовыя Саветы депутатаў працоўных зрабіў депутат Вярхоўнага Савета БССР, старшыня райвыканкома тав. Шугаеў.

Выступаючыя таварышы расказвалі аб лепшых агітатарах, аб недахопах у пастаноўцы агітацыйна-масавай работы сярод насельніцтва. Усяго ў спрачках выступіла па гэтаму пытанню [illegible] чалавек.

У прынятай рэзалюцыі комсамольскі актыў аднадушна адобрыў рашэнні XIV з'езда ЛКСМБ і намеціў практычныя мерапрыемствы па палепшанні [illegible] ў первічных арганізацыях, па ўдзелу іх у важнейшым дзяржаўным мерапрыемстве — выбарах у мясцовыя Саветы депутатаў працоўных.

Міх. Папоў.

Англа-германская вайна

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 3 лістапада (ТАСС). У зводцы вярхоўнага камандавання германскай арміі паведамляецца, што германскія самалёты 2 і ў ноч на 3 лістапада працягвалі налёты на Лондан. Скінуты бомбы на ангары і казармы некалькіх аэрадромаў, а таксама на партовыя збудаванні і прамысловыя прадпрыемствы. Прычынены вялікія пашкоджанні ваеннаму заводу. Ля ўсходняга ўзбярэжжа Англіі германскі бамбардыроўшчык падпаліў непрыяцельскі гандлёвы параход водазмяшчэннем 6 тысяч тон.

Спроба некалькіх непрыяцельскіх самалётаў прыблізіцца да паўночнага ўзбярэжжа Францыі папярэджана германскай зенітнай артылерыяй. Пры гэтым збіта два самалёты. У паветраных баях над Лонданам працівнік страціў яшчэ два самалёты. У часе гэтых аперацый і пры начных налётах, праведзеных у цяжкіх атмасферных умовах, гаворыцца ў зводцы, германская авіяцыя страціла 7 самалётаў.

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 3 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, 2 лістапада буйнае злучэнне англійскіх бамбардыроўшчыкаў зрабіла два найбольш канцэнтраваныя налёты на Берлін. Электрастанцыі, чыгуначныя вузлы, уключаючы тры галоўных вакзалы, бесперапынна бамбардзіраваліся фугаснымі бомбамі буйнага калібру. На Сілезкі вакзал было скінута мноства фугасных і запальваючых бомб, выклікаўшых пажары ў розных пунктах вакзала.

Другія злучэнні англійскай авіяцыі бамбардзіравалі нафтаачышчальныя заводы ў Гельзенкірхене і Магдэбургу. На нафтаачышчальным заводзе ў раёне Гельзенкірхена ў результаце бамбардыроўкі ўзнікла 14 пажараў, 5 з якіх былі асабліва буйнымі. У Магдэбургу буйнае злучэнне англійскіх самалётаў на працягу паўтары гадзіны бамбардзіравала другі буйны нафтаачышчальны завод. Узніклі буйныя пажары. Адзначаны шматлікія ўзрывы.

Сярод другіх аб'ектаў, падвергшыхся бамбардыроўцы, былі чынгуначныя склады ў Оснабруке і заводы Крупа ў Эсэне, дзе запальваючыя бомбы выклікалі пажар і ўзрывы. Акрамя таго, былі зроблены налёты на 16 аэрадромаў Германіі і акупіраваных ею тэрыторый.

ЛОНДАН, 3 лістапада (ТАСС). Англійскае міністэрства авіяцыі апублікавала 2 лістапада наступнае камунікэ: На світанні 2 лістапада 2 буйных злучэнні непрыяцельскіх самалётаў пераасеклі ўзбярэжжа графства Кент. Непрыяцельскія самалёты былі адагнаны яшчэ да таго, як дасягнулі Лондана. Праз паўтары гадзіны быў зроблен другі налёт, у якім удзельнічала кала 100 самалётаў. Гэтыя злучэнні былі таксама адагнаны нашымі знішчальнікамі і агнём зенітнай артылерыі. Адчэп некалькім непрыяцельскім самалётам, ляцэўшым на вялікай вышыні, удалося дасягнуць раёна Лондана. У графстве Кент былі скінуты бомбы. Страты незначны, колькасць афар невялікая. За 2 лістапада нашымі знішчальнікамі збіта 9 непрыяцельскіх самалётаў. Наша авіяцыя не мела страт".

Англа-італьянская вайна

РЫМ, 3 лістапада. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што ўчора 4 злучэнні італьянскіх бамбардыроўшчыкаў у суправаджэнні знішчальнікаў зрабілі налёт на Мальту. Сур'ёзна пашкоджаны партовыя збудаванні і аэрапорт. Збіт адзін самалёт працівніка. Адзін італьянскі самалёт не вярнуўся на сваю базу.

У раёне егіпецкага ўзбярэжжа моцнае злучэнне англійскіх караблёў было атакавана італьянскімі самалётамі. Пашкоджан адзін карабль.

Ва ўсходняй Афрыцы італьянская авіяцыя бамбардзіравала партовыя збудаванні вострава Перым і аэрадром Розейрэс (Англа-Егіпецкі Судан), на якім знішчана два самалёты. У часе паветранай разведкі ў раёне Шасім збіт знішчальнік працівніка; другі непрыяцельскі самалёт сур'ёзна пашкоджан.

Даво італьянскіх падводных лодкі не вярнуліся на свае базы.

Дзеянні італьянскай авіяцыі

РЫМ, 3 лістапада (ТАСС). Агенцтва Стефані паведамляе: „Учора днём адбыўся самы значны з пачатку ваенных дзеянняў налёт італьянскай авіяцыі на Мальту. Кала 100 італьянскіх знішчальнікаў і бамбардыроўшчыкаў прынялі ўдзел у атацы на збудаванні аэрадрома Мікада і на марскую базу на Мальце. У результаце бамбардыроўкі прычынены страты. Звяно знішчальнікаў, якое знаходзілася наперадзе асноўных сіл злучэння, уступіла ў бой з двума звеннямі знішчальнікаў працівніка. У результаце боя быў збіт адзін самалёт працівніка; магчыма, што збіт яшчэ адзін самалёт".

Ваенныя дзеянні ў Грэцыі

ЛОНДАН, 3 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр з Афін, згодна апошніх весткам, грэчаскія войскі ўтрымліваюць пазіцыі на ўсіх франтах, не глядзячы на жорсткія аткі італьянцаў. Тры італьянскіх самалёты былі збіты над грэчаскай тэрыторыяй. Як паведамляюць, лётчык адчаго з грэчаскіх самалётаў, расходаваўшы ўсе снарады, пратаранў адзін італьянскі бамбардыроўшчык. Грэчаскі самалёт згінуў, але лётчык выратаваўся. Згодна паведамленню, італьянскі пасланнік сёння выязджае з Грэцыі. Пасланніку Венгрыі даручана прадстаўляць інтарэсы Італіі. Вялікі пажар, які ўзнік на Корфу пасля бамбардыроўкі, усё яшчэ не патушан.

Як перадае агенцтва Рэйтэр з Белграда, згодна паведамленням наглядальнікаў на грэка-албанскай граніцы, бесперапынная кананада ў раёне ўшчэлля Пісабор зараз спынілася. Гэта ўшчэлле з'яўляецца важнай стратэгічнай пазіцыяй у гарах і вядзе да Салонік праз Фларыну. Гэты раён з'яўляецца падзвычайна цяжка праходзімым. Яго абараняюць адбор[illegible] грэчаскія часці, якія знаюць кожны вяршок гэтай тэрыторыі і прымяняюць метады партызанскай вайны.

Прыбыццё англійскіх ваенных караблёў у Грэцыю

НЬЮ-ЙОРК, 3 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе афінскі карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс, англійскія ваенныя караблі прыбылі на востраў Крыт і ў другія грэчаскія ваенна-марскія базы. Маркуюць, што грэкі і англічане падрыхтоўваюць паветраныя і ваенна-марскія аперацыі супроць італьянскіх баз на Дадэканезскіх астравах. Як указвае далей карэспандэнт, грэкі ўстанавілі артылерыйскія гарматы ў гарах Пісодэрыса, камандуючых над раёнам Корыццы (Корча).

Агенцтва Стефані аб аперацыях на грэка-албанскім фронце

РЫМ, 3 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Стефані перадае наступнае паведамленне з грэка-албанскага фронта: „Метэаралагічныя ўмовы змяніліся. Дождж, вецер і холад апошніх дзён змяніліся сонечным надвор'ем, што дазволіла салдатам заняцца ўстройствам дарог, з'яўляючыся неабходнай і асноўнай умовай далейшага прасоўвання. Войскі гатовы да вялікіх аперацый".

Ініцыятар высокіх норм выпрацоўкі

Электразваршчык паравознага дэпо Брэст-Цэнтральная, комсамолец т. Кажамякін Фёдар 15 кастрычніка стаў на сталінскую вахту ў честь выбораў у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных.

У першы дзень вахты т. Кажамякін выканаў вытворчае заданне на 813 проц. і заробіў за 8 гадзін 132 руб. За 15 дзён кастрычніка сярэднее выкананне нормы ў яго складае 549 проц. за змену. У асобныя дні т. Кажамякін даваў па 6—7 норм за змену. 31 кастрычніка ён выканаў план на 759 процантаў. Якасць выконваемай ім работы заўсёды добрая.

Працуючы па-стахаўску, тав. Кажамякін знаходзіць час вучыць другіх. За кароткі час ён падрыхтаваў у якасці электразваршчыка слесара дэпо т. Лужкова.

У рабоце т. Кажамякіна часта перашкаджае адсутнасць належных умоў і дрэнная абсталяванне электразваркі. Да гэтага часу не выкапана яго прапанова аб устаўленні бачка для зваркі падшыпнікаў, што значна паскорыла-б міжрэйсавы рамонт паравозаў.

Адміністрацыі дэпо неабходна стварыць належныя ўмовы для паспяховай работы т. Кажамякіна.

А. Кудрын.

Адказны рэдактар Г. Т. МІНЧУКОЎ

БРЭСЦКІ МІЖРАЙГАНДАЛЬ
аб'яўляе набор
у школы гандлёвага і кулінарнага вучнёўства на узросце ад 16 да 18 год. Навучаючымся выплачваецца стыпендыя ад 85 да 135 рублёў у месяц па паспяховасці.
Інтэрнат бясплатны

ГАЛАНДСКАЯ ІНДЫЯ

(Даведка)

У сувязі з далейшым абвастрэннем імперыялістычных супярэчнасцей паміж Англіяй і ЗША, з адной краіны, і Японіяй, з другой, у замежнай прэсе з вялікай актыўнасцю абмяркоўваецца пытанне аб лесе Галандскай Індыі.

У саставу Галандскай Індыі, размешчанай на паўднёвым усходзе Азіі, уваходзяць астравы Ява, Суматра, Целебес, Барнео (за выключэннем яго паўночнай часткі, якая належыць Вялікабрытаніі), Малуккія астравы, заходняя частка Новай Гвінеі і другія астравы Малайскага архіпелага.

Тэрыторыя — 1.900 тыс. кв. клм., насельніцтва — 60.750 тыс. чалавек. Плошча Галандыі, валодаючай гэтай калоніяй, саставляе усяго 34,2 тыс. кв. клм. з насельніцтвам у 8.600 тыс. чалавек.

Гэтыя астравы з'яўляюцца адным з важнейшых азіяцкіх крыніц сыравіны і рынкаў збыту. Яны размешчаны на подступах да іншых багацейшых раёнаў Азіі, у прыватнасці да Брытанскай Індыі.

Іменна гэта і выяўляе павышаны інтарэс са стораны буйнейшых імперыялістычных дзяржаў да Галандскай Індыі.

Большасць карэннага насельніцтва Галандскай Індыі занята ў сельскай гаспадарцы. Важнейшыя культуры: рыс, кукуруза, земляныя арэхі (сыравіна для маргарына), соевыя бабы, табак, кофе, гарбата, каўчук, цукровы трэснік, какосавыя пальмы. Рыс і маіс з'яўляюцца асноўнымі сельскагаспадарчымі культурамі і асноўнымі прадуктамі харчавання насельніцтва. Земляробства вядзецца на палях двух тыпаў: арашаемых і неарашаемых. Плантацыйная гаспадарка цалкам звязана з вытворчасцю экспартных культур, важнейшымі з якіх з'яўляюцца: цукровы трэснік, каўчук, гарбата; на Малуккіх астравах ёсць плантацыі мускатнага арэха і гваздзікі. Табачная культура, акрамя буйных плантацый на Суматры, шырока распаўсюджана і на Яве.

Абрабатываючая прамысловасць Галандскай Індыі звязана амаль выключна з перапрацоўкай прадуктаў сельскай гаспадаркі і распрацоўкай карысных выкапняў. Важнай галіной апрацоўваючай прамысловасці, дасягнуўшай вялікага развіцця, з'яўляецца цукровая прамысловасць. Па вытворчасці трасніковага цукру краіна займае чацвертае месца ў свеце. Ёсць многа прадпрыемстваў па перапрацоўцы табакі.

Галандская Індыя займае трэцяе месца ў свеце па вытворчасці гарбаты. На яе прыходзіцца адна трэць суветнай здабычы гарбаты. Ява дае 95—9[illegible] ная прадукцыі.

Астравы Г[illegible] гаты залежам[illegible] ных выкапняў. [illegible] значнае мя[illegible] волава. Камі[illegible] ўсіх буйных [illegible] Барнео, Ява і [illegible] запасы нафты [illegible] суветных) знаход[illegible] частцы Барнео, на Суматры, Яве і Целебесе. Штогодная здабыча дасягае 5,6 млн. тон, г. зн. каля 3,8 проц. суветнай здабычы нафты. Значнае нафтавых крыніц Галандскай Індыі заключаецца і ў тым, што яны з'яўляюцца адзінымі буйнымі месцанараджэннямі ва ўсім заходнім басейне Ціхага акіяна. Галандская Індыя — другі пасля Брытанскай Малаі суветны пастаўшчык волава: на яе долю падае 15 проц. суветнай здабычы гэтага метала. На астравах ёсць багатыя залежы жалезнай руды, марганца, бакоітаў, медзі, хрома, ртуці, вісмута, нікеля, сурмы, золата.

Пераважную ролю ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы Галандскай Індыі грае капітал метраполіі, г. зн. Галандыі. Але галандскія банкі і прамысловыя фірмы па сутнасці з'яўляюцца толькі контрагентамі англійскага капітала. Галандскую Індыю называюць „замаскіраванай калоніяй Англіі". Англійскі капітал пануе фактычна (непасрэдна або праз галандскія фірмы) і ў вытворчасці нафты і вытворчасці каўчука, і ў вытворчасці волава. Буйныя пазіцыі ў нафтавай і каўчуковай прамысловасці займае і амерыканскі капітал. Большая частка амерыканскіх інвестыцый (перавышаючы ў цэлым 200 мільёнаў даляраў) прыходзіцца на гэтыя галіны. „Кампанія Галандска-Амерыканскіх плантацый"—адно з буйных прадпрыемстваў па здабычы каўчука з пераважай амерыканскага капітала [illegible]

На долю Японіі прыходзіцца не больш аднаго процанта ўсіх замежных капіталаўкладанняў у Галандскай Індыі. За апошнія гады японскія фінансісты і прамысловцы набылі тут даволі значныя плантацыі каўчука, какосавых пальм (для вытворчасці копры), нафтаносныя палі на Барнео і т. д.

У 1938 годзе значная частка экспарту Галандскай Індыі падала на Галандыю (20,4 процанта), ЗША (13,6), Сінгапур (16,6). Доля Японіі складала толькі 3,1 процант.

Размешчаныя ля паўдзённа-ўсходняга ўзбярэжжа Азіі астравы Галандскай Індыі прадстаўляюць сабой як-бы натуральны бар'ер паміж Ціхім і Індыйскім акіянамі. Яны ляжаць на важнейшых марскіх шляхах паміж Азіяй і Аўстраліяй, паміж Усходняй Азіяй і Індыяй. Праз іх праходзяць марскія артэрыі Вялікабрытаніі з Еўропы ў Азію, якія мае сваім канцовым пунктам Ганконг. З гэтага відаць стратэгічнае значэнне Галандскай Індыі для Англіі. Непасрэдна ў раёне гэтай галандскай калоніі размешчана асноўная англійская ваенна-марская база на Далёкім Усходзе — Сінгапур. Марскія зносіны Сінгапура з дапаможнымі для яго ваенна-марскімі базамі — порт Дарвін у Паўночнай Аўстраліі, Ленанг на Малаккім паўвостраве, Нікабарскія астравы ля заходняга ўзбярэжжа ў Малаккі праліў — праходзяць у водах Галандскай Індыі.

Англія і амерыканскі [illegible]